**Алімпіяда па беларускай мове і літаратуры ў 2014/2015 навуч. годзе (для 3 класа)**
**Код удзельніка_____**

**1. Запішыце словы ў два радкі:**

1) словы, дзе ўсе зычныя гукі глухія, 2) словы, дзе ўсе зычныя гукі звонкія
*Гульня, вярба, шапка, каса, кошка, зязюля, косіць, бульба.*

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**2.Запішыце словы, змешчаныя ў квадратных дужках, згодна з правіламі сучаснага правапісу.**
[аб'й'ава]_________, [м'л' й'он]_________, [дз' ац' ка] _________ .

**3.З прапанаваных складоў складзіце словы – назвы прадметаў адзення і запішы іх.**
*Галь ка спад па ля шу ні штук ца то лі* ___________________________________________

**4. Перастаўце літары, каб атрымалася слова.**
РОПЯ ______, РАБЯВ _____, ОЛАКАВ ______ .

**5. Устаўце , дзе трэба, прапушчаныя літары.**
*В.дэл.ц, в.ч.ра, д.яўч.нка, лес.іца, дз.веры,в.раб.і,ёс.ць,вокла.ка.*

**6. Рашыце рэбусы, рэбусы- задачкі**. Нара-ра+дзед-д+я= ________ Ліст+а+парк-рк+дом-ом=_______
_____________ ____________






**7. Да слоў левага слупка падбярыце сінонімы(словы блізкія па значэнню) з правага. Злучыце іх лініямі.**

| | |
|---|---|
| Негаварлівы | просты |
| Несур'ёзны | памылковы |
| Нескладаны | легкадумны |
| Няправільны | маўклівы |

**8. Змітрок запісаў пад дыктоўку сказы. Знайдзіце і выпраўце памылкі.**
Деці пайшлі у лес. Надревах залатое лісте.На поўначі беларусі разлілося прагожае возера нарач.

**9.Перакладзіце на беларускую мову.**
Фломастер - __________, одуванчик - ________, открытка - ________, судья- _______.

**10 .Устаўце патрэбныя словы.**

1. Шануй ……. з маткай, другіх не знойдзеш.
2. ……. – людзей смяшыць.
3. Хто працуе, той не ….. .

Слоўнік: карміць, спяшыць, вёска,бацьку, сябрue, сумуе, чытае.

**11. Прыдумайце і ўстаўце рыфмаваныя словы , каб атрымалася забаўлянка.**

Ладу-ладу-ладкі!
Пайшлі мы ……..
Хадзілі ………….
Вадзілі ………….

**Алімпіяда па беларускай мове і літаратуры ў 2014/2015 навуч. годзе (для 4 класа)**

**Код удзельніка_____**

1. **Падкрэсліце словы, у якіх літар больш, чым гукаў.**
   Яблык, пісьмо, заданне, край, цягнік, станцыя, паэма, тэатр, сям'я, Вера, дзень, крылле, здароўе, раён.
2. **Запішыце словы згодна з правіламі сучаснага правапісу.**
   [с'ц'эшка]____________, [дошч]____________, [зй'эхац']________
3. **Вызначце род назоўнікаў. Да кожнага назоўніка падбярыце прыметнік і запішыце словазлучэнні.**

   Мазоль __________________________; насып ____________________;
   боль__________________________; гусь ______________________;
   сабака ________________________; далонь _________________.

4 . **Устауце прапушчаныя літары, падкрэсліце іх.**

Т.лефон, пл.вец, бал.рына, фламаст.р, м.даль, з.мляны, мядз.ведзь, здаро.е, Юр.еўна, Іл.інічна.

5. **Да слоў** ***зямля , вада, горад*** **падбярыце і запішыце па аднаму аднакаранёваму слову, якое адпавядае наступнай схеме:** ¬ ∩ ^ □

________________________________________________________________________

6. **Запішыце словы, якія пачынаюцца з літары "с" і абазначаюць:** 1) від адзення___________, 2) назву месяца ______________ , 3) насякомага-шкодніка ______________ , 4) страва _________.
7. **Дапоўні сказы словамі.**
   Была ________ раніца. Сонца ______ не ўзышло, але ________ заружавела. _________ засвістаў шпак. Ён прыляцеў ______________ . Шпак абвясціў, што ______________ настала.
8. **Перакладзіце словы на беларускую мову.**
   Погода - ____________ , веткі- ________, волк- ________ , гвоздь - __________ , семья - _________, век - ______, богатство - ____________, платок -____________ .
9. **Злучыце стрэлкамі фразеалагізм з адпаведным значэннем:**

| | |
|---|---|
| А) вушы натапырыць | а) вельмі дружна, у поўнай згодзе жыць |
| Б) за адным махам | б) хутка (павінна адбыцца штосьці) |
| В) душа ў душу | в) насцярожыцца, з вялікай увагай слухаць |
| Г) не сёння-заўтра | г) заадно, адначасова, з чым-небудзь другім |

10**. Дадзены прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Замест пропускаў запішыце іх імёны.**

__________ Купала, _________ Васілевіч, ________ Багдановіч, _______ Вітка.

**11.Прачытайце верш "Радзіма".**

Лепей за ўсё мне на свеце мясціна,
Тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос.
Бэз пад акном, і ў полі каліна,
Ціхае сонца, блакіты нябёс.
  Выйдзеш за вёску – жытнёвыя хвалі,
Коцяцца цёплыя плыні наўсцяж…
Клічуць дарогі ў бясконцыя далі…
Самы ты вольны, край бацькоўскі наш.

Кастусь Кірыенка

А)**Падкрэсліць слова, якое адпавядае настрою верша:**

Сумны, радасны, пяшчотны, вясёлы.

Б**)Падкрэсліць прыказку, якая адпавядае зместу верша**.

Дзе пасееш густа, там не будзе пуста.
Жыць – Радзіме служыць.
Усякаму мілая свая старана.

**В)Запісаць адказ на пытанне . Чаму я люблю свой край?**

________________________________________________________________________

________________________________________________________________________